# Прошлы час Präteritum

Простая форма прошлага часу **Präteritum** выкарыстоўваецца для выражэння дзеяння ў прошлым і ўжываецца ў асноўным у апавяданнях.

Форма **Präteritum** слабых дзеясловаў утвараецца:

| аснова дзеяслова + суфікс **-te** + асабовы канчатак* |
|---|

machen **(рабіць)** → mach- + **-te** + асабовы канчатак = **machte**

fragen (пытацца) → frag- + -te = fragte (пытаўся)
lachen (смяяцца) → lach- + -te = lachte (смяяўся)

Форму **Präteritum** няправільных і моцных дзеясловаў трэба запамінаць, напрыклад:

**sein – war, haben – hatte, sitzen – saß, lesen – las**

дзеясловы ў Präteritum змяняюцца па асобах і ліках:

| | **fragen** | **sein** | **haben** | **lesen** |
|---|---|---|---|---|
| ich | fragte | war | hatte | las |
| du | frag**test** | war**st** | hatte**st** | las**est** |
| er / sie / es | fragte | war | hatte | las |
| wir | fragte**n** | war**en** | hatte**n** | las**en** |
| ihr | fragte**t** | war**t** | hatte**t** | las**t** |
| sie / Sie | fragte**n** | war**en** | hatte**n** | las**en** |

* У 1-й і 3-й асобе адзіночнага ліку асабовыя канчаткі адсутнічаюць.